УА «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»
Кафедра беларускай і рускай моў

# РОЛЯ ЭМАЦЫЯНАЛЬНАГА ФОНУ Ў ВЫПРАЦОЎЦЫ МАТЫВАЦЫІ ДА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

А. А. Носік, старшы выкладчык

Мінск 2022

Эмацыянальны бок жыцця чалавека ўплывае на ўсе сферы яго дзейнасці. У працэсе станаўлення асобы эмоцыі выступаюць сродкам псіхалагічнай абароны, сацыялізацыі і прыстасавання да навакольных умоў. Уменне кантраляваць эмацыянальны ўздым і накіроўваць яго ў мірнае рэчышча дасягаецца праз усведамленне асноўных механізмаў узнікнення псіхічных рэакцый, а таксама назіранне за тым, да якіх вынікаў прыводзяць тыя ці іншыя способы паводзін падчас пэўных эмацыянальных станаў.

Навучальны працэс складае значную частку жыцця чалавека, таму ў дадзеных адносінах важна ўлічваць фактары, якія могуць мець станоўчы ці адмоўны ўплыў на закранутую вобласць дзейнасці. Адным з такіх фактараў з'яўляецца эмацыянальны фон, дабратворны ўплыў якога дэманструюць сфарміраваныя схільнасці і здольнасці да прадмета, а таксама высокія паказчыкі засваення зместу вучэбнай дысцыпліны.

Узаемадзеянне з сацыяльным акружэннем, у якім адбываецца працэс навучання асобы, і эфектыўнасць дзейнасці знаходзяцца ў цеснай сувязі адзін з адным і ўплываюць на далейшыя паводзіны, працэсы мыслення, памяць. Сацыяльная прырода мовы як вынік калектыўнай дзейнасці, праз якую адбываецца фарміраванне нацыянальнай свядомасці, непасрэдна ўплывае на развіццё і функцыянаванне мовы, яе рэалізацыю ў розных сферах (Ф. Энгельс). Сфера вышэйшай медыцынскай адукацыі – гэта ўнікальная вобласць ведаў, якая дае магчымасці для прымянення самых разнастайных відаў дзейнасці, накіраваных на выпрацоўку гуманных адносін да навакольных.

Л.С.Выгоцкі быў перакананы, што асоба з'яўляецца ўдзельнікам гісторыка-эвалюцыйнага працэсу, выступае носьбітам сацыяльных роляў і валодае магчымасцю выбару жыццёвага шляху, у ходзе якога ёю ажыццяўляецца пераўтварэнне прыроды, грамадства і сябе самой. Ён сцвярджаў, "што да пачатку кожнага ўзроставага перыяду складваюцца своеасаблівыя, спецыфічныя для дадзенага ўзросту, выключныя, адзіныя і непаўторныя адносіны паміж дзіцем і навакольнай рэчаіснасцю, перш за ўсё сацыяльнай. Гэтыя адносіны мы і назавём сацыяльнай сітуацыяй развіцця ў дадзеным узросце" [с. 258.-432]. Гэта асабліва важна ўлічваць, працуючы ў студэнцкай аўдыторыі. Перыяд паміж падлеткавым узростам і дарослым указвае на наяўнасць пэўнага вопыту, які можа праяўляцца праекцыяй на аб'ектыўную рэальнасць або, наадварот, дазваляе даваць рознабаковую ацэнку новай ці атрыманай раней інфармацыі.

Менавіта з гэтай прычыны новыя веды павінны вызначацца актуальнасцю і арыентавацца на ўключэнне індывідуальных творчых здольнасцей рознага характару, на ўлік асабістых поглядаў і пошук аптымальных вектараў супрацоўніцтва. Праца па рэалізацыі ***грамадска-патрыятычнага***, ***духоўна-маральнага*** і ***эстэтычнага*** накірункаў выхаваўчага працэсу і засваенне найважнейшых жыццёвых каштоўнасцей, такіх як сям'я, праца, талерантнасць, правы чалавека, патрыятызм, служэнне

Айчыне, грамадзянскі абавязак, узаемападтрымка, павага да гісторыка-культурнай спадчыны і законаў сваёй краіны і, канечне, мовы нацыі павінна быць арганізавана ў асяроддзі найперш ўзаемапавагі і гуманнага стаўлення да членаў бліжэйшага сацыяльнага асяроддзя (групы, выкладчыкаў, адміністрацыі навучальнай установы).

Вывучэнне беларускай мовы ў медыцынскай ВНУ ў значнай меры арыентавана на выхаванне культуры паводзін, справядлівасці, здольнасці да суперажывання. Гэта дасягаецца за кошт уключэння ў навучальны працэс твораў беларускіх аўтараў, дзе закранаюцца вельмі важныя пытанні медыцынскай і агульначалавечай маралі (М. Герчык "Здабыццё надзеі", А. Дзялендзік "Выклік багам", А.Федарэнка "Ланцуг" і інш.).

Арганізацыя студэнцкай навуковай дзейнасці на беларускай мове – вельмі неабходны элемент навучання, паколькі гэта спрыяе фарміраванню глыбокіх markedрознабаковых ведаў, уменню карыстацца навуковай літаратурай, адбіраць неабходны матэрыял, выпрацоўваць навыкі валодання менавіта навуковай разнавіднасцю беларускай мовы і тым самым усведамляць яе шырокія камунікатыўныя магчымасці.

Такім чынам, фарміраванне станоўчага псіха-эмацыянальнага фону на занятках, эфектыўнае спалучэнне навукова-даследчай і творчай дзейнасці спрыяе развіццю здольнасцей студэнтаў да авалодання беларускай мовай, а таксама матывуе да далейшага ўдасканалення набытых ведаў і прымянення іх у практычнай дзейнасці.

Літаратура


1. Выготский Л.С. Проблема возраста / Л.С. Выготский. – Собр.соч.в 6 т. – М., 1984. Т.4. – С. 258.-432.